# «Няспынны бег, шалёны бег»

**Новая кніга вершаў выдатнага паэта Мар’яна Дуксы пабачыла свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці». Зборнік пад назвай «Птушка вечнасці—душа» выйшаў у серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі».**




Многія творы друкаваліся ў літаратурных часопісах і альманахах. Пераважная большасць напісана напрыканцы мінулага стагоддзя і на пачатку так званых нулявых. Створаныя ва ўласцівай Мар’яну Дуксе манеры глыбокіх філасофскіх разважанняў, яны застаюцца актуальнымі, а з цягам часу набываюць яшчэ больш каштоўнасці дзякуючы трываласці выкладзеных аўтарам маральных прынцыпаў і эстэтыцы вершаванага радка.

Асабісты вопыт спасціжэння Бога і занепакоенасць лёсам народа, Айчыны, заклапочанасць будучыняй роднай мовы і звілістым лёсам культуры, тэмы расчараванняў і ўсёпераможная любоў да чалавека — вось асноўныя лейтматывы большасці вершаў. Адчуванне сваёй мізэрнасці ў сусвеце і адначасова аптымістычная ўпэўненасць у сіле чалавечага духу, канстатацыя бездапаможнасці перад націскам гвалту і пратэст супраць бездухоўнасці чаргуюцца ў новай кнізе з лірычнымі страфамі і вытанчаным метафарычным гумарам аўтара.

Тры жабы скочылі на корч
І партыю стварылі.
А потым квакалі ўсю ноч,
Аб шчасці гаварылі…

І, як заўжды, вельмі многа ў аўтара рытарычных пытанняў. Ці не кожны другі верш пачынаецца ці заканчваецца так: «Што за суседства адчужаных слоў?», «Выносныя сосны, хто ж я сярод вас?», «...лепей што— геніяльныя дзеці / альбо дзеці, шчаслівыя вельмі?» А вось суцэльны верш-рыторыка:

Няспынны бег, шалёны бег.
Ён з кожным годам нарастае.
Што з гэтага? Душа пустая.
Што мы ўхапілі? Грэх і смех.

Сапраўды, Мар'яна Дуксу можна смела назваць майстрам рыторыкі, бо яго пытанні не патрабуюць адказу: прыводзяць да высноў без аўтарскага тлумачэння звычайных ісцін.

Яшчэ ў зборніку шмат разважанняў пра месца паэзіі і паэта ў сучасным свеце. І тут майстар слова застаецца верным сабе і перакананням. Сваёй творчасцю ён упарта сцвярджае, што вершы не легкадумная пацеха на вясёлай вечарынцы. Паэзія як сястра філасофіі павінна вучыць жыццю па самых высокіх мерках чалавечай адказнасці, быць паходняй, што асвятляе дарогу праз змрок, быць духоўнай ежай, што сілкуе розум маладым і надае душэўнай раўнавагі сталым.

Ала КЛЕМЯНОК

"ЛіМ", №40(4840), 9 кастрычніка 2015 г.